IV корпус, которым я командую, выдержал блестящее сражение с врагом. Задача была захватить населенный пункт и удерживать его в течение дня. Эта задание было выполнено силами одного IV корпуса, несмотря на сложности рельефа и восемь последовательных атак противника. Русские силы превосходили нас почти вдвое…» [3, с. 106]

По версии итальянских историков в битве участвовали около 17 тысяч солдат войска принца Эжена против пятидесятитысячного русского войска, здесь же приводят слова английского генерала Роберта Уилсона, который в 1814 в Мантуе, в присутствии итальянских и австрийских военных высказался так: «Итальянское войско в Малоярославце удивило меня своим героизмом: шестнадцать тысяч храбрецов сражались с восьмидесятитысячным войском Кутузова» [3, с. 120].

О мужестве итальянцев в этой битве свидетельствовали даже генералы противника, среди которых полковник Бутурлин и генерал Беннингсен.

Исторические исследования участия итальянцев в наполеоновской кампании в России достаточно разнообразны. Современные итальянские историки отмечают недостаточную изученность материалов русских архивов, большая часть которых остается непереведенной [4].

1. Colonello Giuseppe Marieni Capobataglione del genio napoleonico nella campagna di Russia nell' Opera del Genio Italiano all' Estero – Gli Uomini d'Arme nelle Campagne Napoleoniche Vol. Unico a cura di Nicolò Giacchi – La Libreria dello Stato, 1940, Capo. VII. [Электронный ресурс] – Режим доступа: 02.02.2012 http://www.marieni-saredo.it/2.2.0%20ITALIANINRUSSIA.htm;
2. Gli italiani in Russia Memorie di un ufiziale italiano per servire alla storia della Russia, della Polonia e dell'Italia. Italia (Firenze), 1826-27, 4 voll.;
3. Ratti Luca Russia, 1812 Malojaroslavets La battaglia degli italiani – ABEditore, 2011;
4. Ilari Virgilio con Piero Crociani e Ciro Paoletti, Storia Militare del Regno Italico 1802–1814, vol. I L'Esercito italiano (t. I Politica, Amministrazione e Stato Maggiore: t. II Armi e Corpi dell'Esercito).

А.Ф. Бубала

ПАЎНОЧНЫ НАПРАМАК. 1812 ГОД НА ДРЫСЕНШЧЫНЕ

Захапіўшы Вільню, Напалеон узнамерыўся ажыццявіць удар на Расію адразу па двух напрамках: на Маскву і на Пецярбург. На маскоўскім напрамку рускія арміі апынуліся ў пагражальным стане. Пад націскам праціўніка 1-я армія Барклая 10 ліпеня прыбыла ў Дрыскі ўмацаваны лагер, пабудаваны па плане генерал-лейтэнанта Фуля. Умацаванні лагера не маглі служыць абароне і актыўным дзеянням супраць французаў.

13 ліпеня на ваеннай радзе ў Бялькоўшчыне генералам удалося пераканаць цара ў абсурднасці ідэі, разлічанай на франтавое сутыкненне з ворагам. Звесткі ж аб руху французаў на Глыбокае прымусілі змяніць план вайны. Новая стратэгія патрабавала ад абедзвюх армій адступаць і як мага хутчэй злучыцца для сумесных дзеянняў. Было вырашана пакінуць лагер, не ўтрымліваць недабудаваную крэпасць Дынабург (цяперашні Даўгаўпілс) і адыходзіць на Полацк. 14 ліпеня армія пераправілася на правы бок Дзвіны, а затым рушыла на Полацк, пакінуўшы ў Пакаёўцах Пяхотны корпус графа Вітгенштэйна. Перад ім ставілася мэтай не прапусціць французаў на Пецярбург. У Полацку Аляксандр I пакінуў войска. 20 ліпеня Барклай працягнуў адступленне на Віцебск. Злучыцца абедзвюм рускім арміям выпала толькі 3 жніўня ў Смаленску.

На поўнач ад галоўнага напрамку рухаліся два асобныя корпусы агрэсара: маршала Удзіно – з мэтай ісці на Пецярбург – і маршала Макдональда, якому ставілася задача ўзяць Рыгу, а пасля садзейнічаць Удзіно, злучыўшыся з яго корпусам. Гэтай задумцы якраз і перашкаджаў корпус Вітгенштэйна. Няпроста было ўзяць і Рыгу.

Вітгенштэйн не здолеў бы выстаяць супраць аб'яднаных сіл французаў. Аднак яны дзейнічалі паасобку. Акрамя таго, на іх шляху стаяла вялікая водная перашкода – рака Дзвіна. Удзіно паспрабаваў перайсці праз яе ў Дынабургу, але не адолеў супраціўлення гарнізона і пайшоў уверх па цячэнні з намерам пераправіцца ў створы іншых шляхоў на Піцер. Тымчасам ваенны губернатар Рыгі запёрся ў горадзе з моцным гарнізонам. Чакаючы асадную артылерыю з Прусіі, Макдональд не траціў сілы на штурм. Ён рушыў на дапамогу Удзіно і 5 жніўня захапіў пакінуты ўсімі Дынабург. Аб'яднанне стала для французаў найпершай мэтай.

Іншыя шляхі, якімі Удзіно мог рухацца на паўночную сталіцу, праходзілі праз Друю або Полацк. Самы кароткі – Друйскі – тракт па тэрыторыі Дрысенскага павета праходзіў ад Прыдруйска (Піедруя) праз Юльянова, Расіцу, Замошша (Савейкі) і далей на Палішчына (Шкяўнэ) і Себеж. Спроба рушыць Друйскім трактам была рашуча адсечана славутым генералам Кульневым, які ўзначальваў пяцітысячны кавалерыйскі атрад у складзе корпуса Вітгенштэйна. Граф, жадаючы атрымаць дакладныя звесткі аб сілах і намерах праціўніка, які хаваўся за вышынямі ля Друі, загадаў уначы з 14 на 15 ліпеня аднавіць мост насупраць горада і даручыў Кульневу правесці ўзмоцненую разведку. 15 ліпеня авангард Кульнева перайшоў Дзвіну. Казакі не толькі выбілі французаў з Друі, але і зладзілі паспяховы кідок на 15 вёрст углыб варожых пазіцый. У гэтай удалай кавалерыйскай аперацыі рускіх французы страцілі да 300 чалавек, а ў ліку палонных – і брыгаднага генерала Сен-Жэнье.

22 ліпеня Удзіно падышоў да пакінутага Дрыскага лагера і, разбурыўшы яго, рушыў левым берагам уверх па Дзвіне. 26 ліпеня маршал без бою ўвайшоў у Полацк.

Вітгенштэйн не чакаў, што прынясе яму лёс. Апынуўшыся між двух агнёў, ён вырашыў актыўна супрацьдзейнічаць іх злучэнню. Авангард увесь час вёў актыўную разведку па абодвух берагах Дзвіны. Ля Друі і пакінутага лагера ладзіліся часовыя масты, у Ляшкове 20 ліпеня разведчыкі пераправіліся ўброд. У выніку карціна прасоўвання французаў была зразумелай, і генерал манеўраваў па Дрысеншчыне, штодзень выбіраючы найлепшую пазіцыю, каб не толькі даць адпор, але і адсунуць праціўніка, які пагражаў як з боку Дынабурга, так і з боку Дзісны ды Полацка. Штаб і асноўныя сілы сталі ўрэшце ў Расіцы, у Бабах знаходзіўся рэзерв, дазоры стаялі па ўсёй Дзвіне.

25 ліпеня авангард Кульнева рассеяў некалькі французскіх атрадаў. Ад палонных рускія даведаліся, што Удзіно плануе прарвацца на Пецярбург праз Себеж, імкнучыся абысці рускі корпус з поўначы. Да раніцы 29 ліпеня разведка данесла, што Удзіно рушыў ад Полацка Себежскім трактам. Апынуўшыся ў адчайным становішчы і асцерагаючыся злучэння Удзіно з Макдональдам, Вітгенштэйн вырашыў скарыстаць адзіны шанц – нягледзячы на няроўнасць сіл, атакаваць корпус Удзіно. Прабіцца на Себеж прасёлкамі раней за французаў рускія не паспелі б.

Граф вырашыў атакаваць ворага ў Клясціцах і ўначы на 30 ліпеня рушыў з Расіцы на Каханавічы і Марачкова (Кацярынава). Мост праз Свольну ў Марачкове быў слабенькі, пераправа ішла з асцярогай, марудна; артылерыю разбіралі і пераносілі па частках. Пераправа больш за 20 тысяч чалавек і больш за сотню гармат заняла б зашмат часу, але хутка быў пабудаваны новы мост з бярвення разабраных хат. Адпачынак паспрыяў асвяжэнню сіл, і бой, завязаны рускімі ў Якубове, быў паспяховым. Развіваючы поспех, Вітгенштэйн пайшоў на штурм французаў у Клясціцах. Рашучасць яму надавала разуменне сітуацыі. Барклай ужо пакінуў Віцебск і рухаўся к Смаленску, што дазволіла Напалеону паслаць падмацаванне Удзіно. Марудзіць рускім не выпадала.

Пра Клясціцкую бітву 31 ліпеня 1812 года напісана шмат навуковых прац, мастацкіх кніг і одаў, створана нямала жывапісных палотнаў. Гэта бітва перакрэсліла напалеонаўскі план лёгкага паходу на Пецярбург. Усе далейшыя спробы рэалізаваць план удара па абедзвюх сталіцах былі марнымі. Ад Клясціц гнаныя Вітгенштэйнам французы вымушаны былі адступіць да Полацка. Іх спробы замацавацца ля Галоўчыц, Сакалішча, Баяршчыны не мелі поспеху, бо рускія няспынна насядалі на праціўніка. Падчас такой гарачай пагоні 1 жніўня загінуў генерал-герой Я.П. Кульнеў. Да нашага часу на строме над ракою Дрысай ля былога Сівошына захавалася першасная магіла адважнага ваяра.

Вітгенштэйн не траціў пільнасці і актыўна адсякаў усе далейшыя спробы французаў прабіцца на Піцер. Дрысенскі павет стаў неадольнай заслонай для агрэсара на шляху да мэты. Імклівыя бойкі супраціўнікаў успыхвалі пад Філіповам, у Лазоўцы, пад Каханавічамі і ў іншых месцах. Французы вырашылі ўшчаміцца паміж вялікімі дарогамі і прайсці на поўнач праз Асвею. У тыя часы існаваў бальшак ад Дзісны праз Валынцы і Каханавічы, і Удзіно вырашыў скарыстаць яго для прарыву на Пецярбург. Спроба французаў ажыццявіць гэты план апісана ў “Дарожных нататках” даследчыка Л.Драке, які прайшоў слядамі баёў на Свольне ў 1912 годзе.

Мясціна, на якой адбываўся бой ля р. Свольны, знаходзіцца на поўнач ад дугі, што апісвае рака паміж вёскамі Галубава і Пользіна. Здалёк на поле бітвы амаль дакладна ўказвае жалезная вышка – “маяк” сярод шырокіх бязлюдных палёў. “Апошняй з магікан” тут засталася невялічкая вёска Зара, што прытулілася да ракі на правым беразе.

Па колькасці войскаў абодвух бакоў бой 30 ліпеня не быў маштабным і адбываўся, галоўным чынам, каля дзвюх перапраў цераз раку – ля мызы Свольна (зараз вёска Зара) і паблізу в. Востры Канец (перастала існаваць у 1982 годзе; апошнія 20 год мела назву Рачная), якія знаходзіліся адна ад другой амаль на дзве вярсты.

Падзеі развіваліся наступным чынам. Пасля бітвы 1 жніўня пры Галоўчыцах корпус маршала Удзіно адступіў к Полацку, дзе 6-га чысла злучыўся з корпусам Сен Сіра, а войскі 1-га корпуса графа Вітгенштэйна к 8-му чыслу адыйшлі да Расіцы, высунуўшы авангард к Пакаёўцам і асобны атрад у напрамку Валынцаў. Пакутуючы ад раны ў скронь, атрыманай у бітве пры Галоўчыцах, Вітгенштэйн выехаў у Асвею, перадаўшы часовае камандаванне войскамі свайму начальніку штаба генералу Даўрэ з указаннем пачаць наступальныя дзеянні ў напрамку на Каханавічы, куды войскі корпуса і пачалі рухацца 10 жніўня. У той жа час і маршал Удзіно, вырашыўшы пачаць наступленне, накіраваў войскі свайго корпуса таксама да Каханавічаў; корпус жа Сен Сіра спыніўся ў бяздзеянні каля Валынцаў.

10 жніўня Каханавічы былі заняты перадавымі часцямі французаў. Амаль адначасова падышлі туды і авангарды рускіх пад камандай генералаў Гельфрэйха і Казачкоўскага. Яны атакавалі праціўніка і хутка адкінулі яго назад, за Палыкаўшчыну і Мамонаўшчыну, аж да вышынь правага берага Свольны паблізу вёскі Пажарышча.

Ноч і ранак 11 жніўня прайшлі спакойна, француз бяздзейнічаў, нягледзячы на значную перавагу ў сілах; перадавыя яго войскі займалі вышыні на *правым* беразе Свольны, а галоўныя сілы сталі на пазіцыях *левага* берага, насупраць перапраў. Гэта было тактычнай прамашкай.

Мяркуючы, што бяздзеянне праціўніка тлумачыцца чаканнем падмацавання, генерал Даўрэ вырашыў аднавіць напад, і бой пачаўся ўзмоцненай рэкагнасцыроўкай авангардаў. Французы былі хутка адкінуты да перапраў праз Свольну, рускія войскі сталі на пакінутых імі пазіцыях, і затым пачаўся бой ужо

за пераправы. Рака Свольна мае тут звілістае цячэнне і нешырокае рэчышча; берагі ж яе на ўсім працягу абрывістыя і парослыя кустоўем. Нягледзячы на нязначную шырыню, Свольна ўяўляла (і ўяўляе зараз) сабой істотную перашкоду, пераадольную толькі па мастах.

Гаспадарскі дом з шэрагам пабудоў, пад агульнай назвай мыза Свольна, стаяў над ракой. Сад акружаў частакол, стоячы за якім грэнадзёры Пермскага палка сустракалі згубным агнём кірасіраў дывізіі Думерка. Бой ля мызы вылучаўся асаблівай упартасцю; тут загінуў камандзір 25-га егерскага палка палкоўнік Дзянісьеў, якому ядром адарвала галаву, і тутсама асабліва вызначыўся маёр Пермскага палка Тарбееў, які кінуўся з паляўнічымі грэнадзёрскай роты на мост для падтрымкі стралкоў, атакаваных французскімі кірасірамі; французы, пераследуючы стралкоў, праскакалі цераз мост і ўварваліся на мызу, але, атакаваныя некалькімі эскадронамі Гродзенскага гусарскага палка, павярнулі назад да пераправы і амаль усе загінулі, часткай пераколатыя гусарамі і перабітыя паляўнічымі, часткай патануўшы ў рацэ.

Адначасова бой ішоў ля вёскі Востры Канец. Бой у гэтым напрамку скончыўся некалькі раней поўнай паразай праціўніка, што дало магчымасць своечасова падтрымаць суседзяў ля мызы і канчаткова адкінуць француза за раку. У “Гісторыі 14-га уланскага Ямбургскага палка” Крастоўскага расказаны адзін цікавы эпізод гэтага бою.

“Нам удалося,– кажа аўтар,– як немага лепш замаскіраваць сваю артылерыю. Паказваючы намер атакаваць, мы падышлі да французаў на блізкую адлегласць і ў той самы момант, калі яны, думаючы, што насупраць іх знаходзіцца адзін толькі кавалерыйскі полк, хацелі сваімі пераўзыходнымі сіламі пакараць яго за дзёрзкасць, мы раптам заскакалі першым дывізіёнам паўзводна направа, другім – паўзводна налева і ў кар’ер ачысцілі фронт для артылерыі. Але не паспелі мы яшчэ стаць за яе флангамі ў прыкрыццё, ды і французы не апамяталіся яшчэ ад нечаканасці гэтага манеўра, як наша батарэя грымнула ўжо супраць іх знішчальным агнём сваіх цяжкіх гармат” [3, с. 204–205]. Пяхота рускіх на штыках уварвалася ў вёску, выбіла адтуль французаў і адкінула іх за раку, прычым яны ўсё ж паспелі запаліць некалькі пабудоў вёскі і мост.

Бой 11 жніўня на рацэ Свольне меў важныя наступствы. Упартасць і настойлівасць дзеянняў рускіх войскаў прымусілі Удзіно не толькі адкласці прадпісанае Напалеонам наступленне, але і адысці к Полацку. У баі 11 жніўня страты рускіх войскаў дасягнулі забітымі і параненымі да 500 чалавек (па іншых звестках – 700 [1, с. 381]), страты ж французаў да 1500 і, звыш таго, 300 чалавек было ўзята ў палон. Генерал-маёр Даўрэ за галоўнае камандаванне ў гэтай справе быў узнагароджаны ордэнам Св. Георгія 3 класа. Спроба рускіх атакаваць Полацк у сярэдзіне жніўня не ўдалася, бо да гэтага часу французскія маршалы ўжо пачалі дзейнічаць узгоднена. Але француз на Піцер так і не прарваўся.

На Дрысеншчыне Вітгенштэйн упершыню выступіў у самастойнай ролі – фактычна камандуючага асобнай арміяй. Уражанне ў Расіі ад Клясціцкай перамогі было велізарным. Граф быў абвешчаны «выратавальнікам Пецярбурга» і ўзнагароджаны ордэнам Георгія 2-й ступені. Да восені ў шэрагі войскаў уліліся новыя дружыны апалчэнцаў. 6 кастрычніка Вітгенштэйн перайшоў у наступ і назаўтра штурмам авалодаў Полацкам. 26 кастрычніка яго войскі занялі Віцебск.

Праз сто год новы гаспадар мызы сп. Заракоўскі засведчыў, што яшчэ на пачатку 1860-х гг. сабрана была з навакольных палёў значная колькасць ядраў і куль і закапана на адным з двароў мызы, але дзе менавіта – зараз невядома. [2, с.148]. Сёння знаходкі рарытэтаў на полі бітвы – выпадак рэдкі. Непадалёк ад мы-

зы, але на левым беразе ракі, знаходзілася на строме сярод гаю невялікая сельская царква; у маціцу яе столі было ўроблена ядро, якое засела падчас бою 11 жніўня 1812 года, прабіўшы царкоўны дах. Да ядра была прымацавана дошка з надпісам "У памяць 1812 года". У наш час на месцы царквы ў гайку застаўся толькі друз; сама цэркаўка была разбурана ў гады разгулу ваяўнічага атэізму.

Яшчэ праз сто год, нашым часам, у вёсцы Зара месца былога маёнтка можна вызначыць па прысадах векавых дрэў ды рэштках сажалкі. На ранейшым месцы знаходзіцца і мост праз Свольну, вядома ж, іншы – капрызлівая рака паспела ўжо не раз пабурыць створаныя чалавекам пераправы. Мост каля Вострага Канца не існуе. Толькі самы настойлівы можа прабрацца праз чаромхавыя спляценні надбярэжжа, каб пабачыць рэшткі чорных замшэлых паляў. Пабыўшы ў гэтых мясцінах, міжволі думаеш пра наш абавязак не разбураць старыя і ствараць новыя масты Памяці паміж пакаленнямі, каб надзейнымі былі нашы крокі ў будучыню.

Спакойную аднастайнасць зарэчных разложыстых мясцін Галубаўшчыны парушае невялічкая выспа-баравінка крыху суровага выгляду. Гэта – месца пахавання французскіх ваяроў, загінулых на Свольне. Паблізу праходзіць гравійка. Магільны ўзгорак знаходзіцца над штучнай азярынай. Месца пахавання варта ўзяць пад афіцыйную апеку, надаўшы яму статус помніка гісторыі, і добраўпарадкаваць. У планах краязнаўцаў – праца па выяўленні месца пахавання рускіх ваяроў, загінулых у бітве на Свольне.

1. Богданович, М.И. История Отечественной войны 1812 г. / М.И. Богданович. – СПб., 1859. – Т. 1.
2. Драке, Л.Л. На местах боя 30 июля 1812 г. у р. Свольны: военно-ист. сборник / Л.Л. Драке. – СПб., 1912.
3. Крестовский, В.В. История 14-го уланского Ямбургского полка / В.В. Крестовский. – СПб., 1873.

Дадатак

Маршруты 12 паходаў па мясцінах падзей 1812 г. на Верхнядзвіншчыне

1. Верхнядзвінск– Валынцы – Свольна – Галубава – ур. Забор'е – Зара – Сакалоўшчына – Першамайская – Бялькоўшчына – Верхнядзвінск.

Маршрут веласіпедны, 75 км, 2 дні; начлег у Галубаве або (з палаткамі) ў Забор'і.

2. Верхнядзвінск – Бялькоўшчына – Узмёны – Слабада – Дварчаны – Верхнядзвінск.

Маршрут веласіпедны, 45 км, 2 дні; начлег у Дварчанах (з палаткамі) на беразе Дзвіны.

3. Верхнядзвінск – Узмёны – Слабада – Лявонпаль – Павяцце – Друя – Мёры – Верхнядзвінск.

Маршрут веласіпедны, 120 км, 3 дні, начлегі: 1 – вадаспад на р. Вята, 2 – Ідолта (на адваротным шляху з Друі); на аўтобусе, матацыкле – 1 дзень.

4. Верхнядзвінск – Каханавічы – Клясціцы – Сівошына – Полацк – Валынцы – Верхнядзвінск.

Маршрут веласіпедны, 175 км, 5 дзён, начлегі: 1 – Серабранка, 2 – Кульнева, 3 – Ахотніца, 4 – Валынцы; на аўтобусе, матацыкле –1 дзень.

5. Верхнядзвінск – Каханавічы – Дзёрнавічы – Кульнева – Сівошына – Замшаны – Грамошча – Боркавічы – Валынцы – Верхнядзвінск.

Маршрут веласіпедны, 110 км, 3 дні; начлегі: 1 – Кульнева (гар. Сокал), 2 – Валынцы.

6. Верхнядзвінск – Шатрова – Расіца – Сар'я – Верхнядзвінск.

Маршрут веласіпедны, 65 км, 2 дні, начлег у Расіцы.

7. Верхнядзвінск – Слабада – Дварчаны – Бароўка – Верхнядзвінск.

Маршрут лыжны, 15 км, 1 дзень.

8. Верхнядзвінск – Бялькоўшчына – Бароўка – Верхнядзвінск.

Маршрут пешы, 12 км, 1 дзень.

9. Сакалоўшчына – ур. Пагост – Зара – ур. Пажарышча – Французская магіла – ур. Забор'е – Галубава.

Маршрут пешы, 12 км, 1 дзень.

10. Галубава – Жоўтаўшчына – ур. Маставуха – Зара – ур. Пагост – Сакалоўшчына.

Маршрут пешы, 9 км, 1 дзень.

11. Клясціцы – Верхнядзвінск (р. Нішча – р. Дрыса).

Маршрут водны, 100 км, 5 дзён, начлегі: 1 – Старасекаў Двор, 2 – вусце р. Нішча (Кульнева), 3 – Буракова, 4 – Ахрэмцы.

12. Сар’я – Верхнядзвінск (р. Сар’янка – р. Зах. Дзвіна).

Маршрут водны, 30 км, 3 дні, начлег і днёўка на Шатроўскім востраве (з выхадам на месца Дрыскага вайсковага лагера).*

***** маршрут можа быць пачаты ад Зашчырына; выхад на ур. Бабы – месца стаянкі рэзерва рускіх войск; дадатковы начлег ля вусця Віранкі.

Тэматычныя экскурсійныя аб’екты на маршрутах:

Верхнядзвінск – помнік у гонар 100-годдзя перамогі ў Айчыннай вайне 1812 г.
Філіпова – поле бітвы 1812 г. ва ўр. Лазоўка
Валынцы – экспазіцыя музея І.Чэрскага аб вайне 1812 г.
Сівошына – помнікі на месцы гібелі генерала Я.Кульнева
Клясціцы – помнік у гонар перамогі ў Айчыннай вайне 1812 г.; школьны музей
Бялькоўшчына – месца ваеннай рады Аляксандра І
Шатрова – мясціны перапраў Дрыскага вайсковага лагера
Дварчаны – мясціны палявых умацаванняў Дрыскага вайсковага лагера
Друя – мемарыяльны знак у гонар падзей 1812 г.
Расіца – Друйскі тракт; месца базавання штаба і галоўных сіл Вітгенштэйна
Ур. Пагост – месца былой царквы з замураваным гарматным ядрам
Ур. Забор’е – магіла, дзе пахавана каля 1,5 тыс. французскіх ваяроў
Ур. Пажарышча – месца галоўнай бітвы ў ліпені 1812 г.
Зара – месца бітвы за пераправу праз Свольну
Жоўтаўшчына – месца бітвы за пераправу ў былой вёсцы Востры Канец
Мёры – экспазіцыі краязнаўчага музея аб падзеях 1812 г.
Полацк – помнікі і экспазіцыі краязнаўчага музея аб падзеях 1812 г.

Галоўныя экскурсійныя аб’екты па пабочных тэмах:

Верхнядзвінск – экспазіцыі музея СШ№2, старадаўнія пахаванні на могілках
Каханавічы – магіла І.Храпавіцкага, Святы ключ, клуб “Белыя вароны”
Сар’я – неагатычны храм, парк
Расіца – Траецкі касцёл, старадаўнія пахаванні на могілках, руіны царквы
Лявонпаль – палац І.Лапацінскага, музей радзімазнаўства, Калона
Свольна – помнік на месцы сядзібы І.Чэрскага
Узмёны – Свята-Мікалаеўская царква
Клясціцы – ГЭС на р. Нішча, мемарыяльныя могілкі савецкіх воінаў
Мёры – музей кнігі, Успенскі касцёл
Кульнева – гарадзішча Сокал
Друя – архітэктурныя помнікі, Барысаў камень, юдэйскія могілкі
Ідолта – помнікі архітэктуры
Сар’янка – агаленні дэвона, земляныя печы па выпальванні вапняку і інш.

В.А. Ермалёнак
МЁРШЧЫНА Ў ВАЙНЕ 1812 ГОДА

Сучасны Мёрскі раён у пачатку XIX стагоддзя ўваходзіў у Дзісенскі, а заходняя яго частка – ў Браслаўскі павет. Роля Мёршчыны ў вайне была вызначана яшчэ перад вайной згодна плану, які быў распрацаваны ваенным саветнікам генерал-лейтэнантам К.Л. Фулем і зацверджаны Александрам 2. Згодна плану, рускія арміі павінны былі адразу адступаць, манеўраваць, пазбягаць генеральных бітваў да ўмацаванага лагеру, які павінен быў знаходзіцца на флангу наступаючых французскіх войск. Па даручэнню Барклая дэ Толі падпалкоўніку барону Вольцогену было даручана знайсці месца, зручнае для пабудовы ўмацаванага лагеру паміж Дняпром і Дзвіной. З чэрвеня па верасень Л.Вольцоген вывучаў вялікія прасторы: ад Рыгі да Дзісны. Шляхі Вільня – Дынабург – Дрыса, Вільня – Мінск – Орша, Віцебск – Орша – Магілёў – Стары Быхаў, Стары Быхаў – Бабруйск – Нясвіж – Слонім – Пружаны – Кобрын – Брэст; Брэст – Дубна – Жытомір – Кіеў. Толькі ў кастрычніку ён вярнуўся зноў у Пецярбург. За гэты час ён